# РЭЦЭНЗІІ

## З ПАВАГАЙ ДА ТВОРЧАЙ АСОБЫ

*Рэцэнзія на кнігу: Дзятко, Д. В. Мовазнаўцы : нарысы па гісторыі беларускай лінгвістыкі / Д. В. Дзятко, П. А. Міхайлаў. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. – 496 с.*

## WITH WARM REGARDS TO CREATIVE PERSON

*Review of the book: Dzyatko, D. Linguists : essays on the history of the Belarusian linguistics / D. Dzyatko, P. Mikhaylau. – Minsk : A. Yanushkevich, 2017. – 496 p.*

На шляху свайго цывілізацыйнага развіцця чалавецтва даўно прыйшло да разумення таго, што паспяховае існаванне кожнага ў жыцці і прафесіі забяспечылі тыя, хто жыў і працаваў да нас. Менавіта папярэднікі стварылі ўмовы для далейшага паступовага руху наперад, а значыць, яны ў поўнай меры заслужылі ўвагу, павагу, цікавасць да іх жыцця і дзейнасці.

Сказанае мае непасрэднае дачыненне і да мовазнаўства як сферы грамадскай дзейнасці. Не адно пакаленне навукоўцаў шчыра працавала на ніве беларускай лінгвістыкі, каб забяспечыць сучасны стан яе развіцця. Аўтары сабраных у кнізе нарысаў добра гэта ўсведамляюць, таму і вырашылі ўспомніць тых, хто займаўся мовазнаўствам у акадэмічных інстытутах і вышэйшых навучальных установах, хто разумеў сілу і значэнне мовы як найважнейшага сродку камунікацыі.

Кніга, што ўбачыла свет зусім нядаўна, утрымлівае 47 нарысаў. У прадмове аўтары імкнуцца растлумачыць, чаму менавіта абраныя мовазнаўцы прыцягнулі іх увагу. Прапануецца лічыць, што «кніга ў многім суб’ектыўная» (с. 3), але права на суб’ектывізм абгрунтавана, і з гэтым абгрунтаваннем нельга не пагадзіцца: індывідуальная цікавасць да той ці іншай асобы, захаванасць звестак у архівах і бібліятэках, асабістае знаёмства з героямі нарысаў. Добра, што аўтары палічылі неабходным растлумачыць сваю пазіцыю. Гэта не зусім, але ў значнай ступені прыглушае стракатасць імён і дат.

Першы раздзел кнігі ўтрымлівае нарысы пра тых, чые імёны ў спісе класікаў усходнеславянскага, славянскага і сусветнага мовазнаўства: А. А. Шахматаў, М. М. Дурнаво, Я. Ф. Карскі, С. К. Буліч, І. І. Насовіч. Самы вялікі па аб’ёме нарыс прысвечаны акадэміку Я. Ф. Карскаму, якога па праве лічаць бацькам навуковага беларусазнаўства. Гэты нарыс дастаткова падрабязны і ўносіць свой уклад у беларускую карскініяну.

Другі раздзел апавядае пра мовазнаўцаў, прозвішчы якіх гучаць нячаста. Можна з упэўненнасцю сказаць, што аўтары выправілі гістарычную несправядлівасць і ўспомнілі пра М. В. Азбукіна, М. В. Байкова, А. С. Карзона, С. Л. Рохкінд, А. П. Круталевіча, А. Б. Курылу, Л. І. Леўшчанку.

Аўтара гэтых радкоў асабліва зацікавіў трэці раздзел кнігі, дзе змяшчаюцца нарысы пра лінгвістаў савецкіх часоў, пра тых, хто ўжо пайшоў ад нас, і пра тых, хто яшчэ жыве. Пра сваіх герояў у прадмове Д. В. Дзятко і П. А. Міхайлаў пішуць, што менавіта яны праз асабістае знаёмства, навуковыя або педагагічныя кантакты паўплывалі на іх прафесійнае станаўленне. Тое ж і мы можам сказаць пра сябе.

Лёс склаўся такім чынам, што амаль усё наша прафесійнае жыццё, за выключэннем пяцігадовай настаўніцкай працы, звязана з Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытутам імя Максіма Горкага – Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Максіма Танка. У першай палове сямідзясятых гадоў мінулага стагоддзя на філфаку мяне вучылі М. Г. Булахаў, І. М. Гайдукевіч, Л. П. Падгайскі, Ф. М. Янкоўскі. Потым я працавала з імі і з А. М. Бардовічам, М. С. Васілеўскім, М. Ц. Кавалёвай, А. А. Каўрусам, К. М. Панюціч, К. У. Скуратом, М. С. Яўневічам.

Аўтары нарысаў імкнуцца ацаніць уклад кожнага з іх у айчыннае мовазнаўства, у станаўленне і развіццё сярэдняй і вышэйшай адукацыі Беларусі. Нельга не пагадзіцца з тым, што ўсе героі нарысаў добра адчувалі слова, разумелі яго, імкнуліся пазнаць яго глыбіні. Асобна хочацца падкрэсліць, што справай жыцця для іх станавілася і роднае беларускае слова.

На жаль, большасць нарысаў напісана яшчэ і для таго, што называецца pro memoria, для памяці. Натуральны ход жыцця падразумявае змену пакаленняў, таму вельмі важна помніць тых, хто быў у тваёй прафесіі, тым больш, калі ты працаваў побач. Гэту мемарыяльную функцыю кніга Д. В. Дзятко і П. А. Міхайлава з поспехам выконвае.

Змешчаныя пасля кожнага нарыса спісы літаратуры дапамогуць тым, хто жадае даведацца больш пра ўзгаданага мовазнаўцу і яго дзейнасць.

Асобна хочацца звярнуць увагу на паліграфічнае выкананне выдання. Дызайн вокладкі, старонак створаны не толькі з густам, але і з душой. На вокладцы змяшчаецца рэдкі фотаздымак калектыву навукоўцаў былога Інстытута мовазнаўства (многія з іх потым не адзін год працавалі выкладчыкамі МДПІ – БДПУ), здымак галоўнага корпуса МДПІ. Выявы можна разглядаць, яны ўтвараюць асобны інфармацыйны і эмацыянальны пласт выдання.

Фотаздымкі ў кнізе таксама вельмі цікавыя, таму што ў іх – жывое жыццё герояў.

Па выніках кароткага рэцэнзавання кнігі Д. В. Дзятко і П. А. Міхайлава «Мовазнаўцы» хацелася б сказаць наступнае. Справа зроблена добрая, карысная; нарысы атрымаліся змястоўныя; аўтары распавядаюць пра сваіх герояў з удзячнасцю, любоўю і павагай.

На наш погляд, ёсць усе падставы лічыць, што гэта толькі пачатак сістэматычнай працы па ўшанаванні вялікай колькасці тых, хто працаваў даўно ці не вельмі даўно на мовазнаўчай ніве, хто стаў ці не стаў класікам, але прысвяціў сябе служэнню слову. Па кнізе відаць, што ў аўтараў ёсць цікавасць да праблемы, вопыт працы з архіўнымі матэрыяламі, з успамінамі, бібліятэчнымі фондамі. У такім разе застаецца пажадаць ім поспехаў.

*Доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ*

**Т. Р. Трафімовіч**

*Doctor of Philology, Professor, Head of the Department of the Belarusian and Russian Linguistics, BSPU*

**T. Trofimovich**